# Пад мірным небам Беларусі

**У Доме літаратара адбылася сустрэча сувораўцаў са старшынёй Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхасём Пазняковым і кампазітарам Віктарам Мяцельскім.**



*Фота Васіля Кулікова.*

Літаратурна-музычнае мерапрыемства «Пад мірным небам Беларусі», прысвечанае 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, — сумесны творчы праект Саюза пісьменнікаў Беларусі і Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча, дзе ўдзяляюць вялікую ўвагу патрыятычнаму выхаванню.

Тэматыка паэзіі Міхася Пазнякова надзвычай разнастайная: Радзіма, бацькоўская хата, родная мова, гістарычнае мінулае… У Доме літаратара гучалі яго вершы «Беларусь», «Матуля», «9 мая», «Спявае жыта» і інш. Міхась Паўлавіч расказаў, што ўкладвае ў паняцце «патрыятызм», а таксама якімі якасцямі павінен валодаць сучасны суворавец. Распавёў, праз якія невыносныя пакуты прайшоў народ, каб сёння хлопчыкі-падлеткі, шчасліва жылі пад мірным небам. Заклікаў сувораўцаў праз усё жыццё захоўваць памяць аб тых смелых, мужных і адважных людзях, многія з якіх цаной свайго жыцця здабывалі для нас шчасце жыць у міры і згодзе. Сувораўцы 4 узвода 3-й роты разам са сваім выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры Наталляй Буркевіч падрыхтавалі змястоўныя і цікавыя пытанні, на якія Міхась Паўлавіч адказаў падчас сустрэчы.

Віктар Мяцельскі спецыяльна прыехаў на сустрэчу з сувораўцамі з роднага Пінска. Ён выканаў песні на словы Міхася Пазнякова «Заўжды вярнуся», «Присяга», «К единству» і інш., музыку да якіх напісаў.

Напрыканцы сустрэчы камандзір 4 узвода 3-й роты капітан Дзмітрый Літвінюк уручыў Міхасю Пазнякову памятную кнігу «Нам с детства каждому вручили это имя», прысвечаную 70-гадоваму юбілею МСВВ. А старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ перадаў у бібліятэку вучылішча нумар часопіса «Армия и культура», у якім надрукаваны творчыя работы сувораўцаў Міхаіла Сарокіна, Паўла Ковеля, Глеба Радзюка, і пажадаў юнакам навучыцца пераадольваць цяжкасці ў жыцці, паважаць бацькоў, цаніць сяброўства, любіць родную краіну, быць сапраўднымі абаронцамі Айчыны і берагчы мір на сваёй зямлі.

**Вераніка КАЛАМІЙЦАВА**